# Як да нас прыйшла кніга

П

Д

І

К



М

З

Ц

Г

Малеева Т.В., ГУО «СШ № 21 г. Бобруйска»

Паняцці

Летапіс



Вежа

# Даты

**Пачатак
12 стагоддзя**



# Імёны

Кірыла Тураўскі



# Заданні

У пачатку 12 стагоддзя ў Тураве нарадзіўся хлопчык. Калі ён вырас, то стаў манахам і узяў імя Кірыла. Ён пачаў пісаць павучанні пра тое, як павінны жыць людзі.

Каб замаліць людскія грахі, Кірыла Тураўскі стаў пустэльнікам. Ён добраахвотна зачыніўся ў высокай драўлянай вежы на беразе Прыпяці. Доўгія месяцы туды яму насілі толькі ваду і хлеб. У гэты час ён напісаў малітвы, якія вядомы і цяпер. Кірыла Тураўскі заклікаў людзей любіць адзін аднаго. Сучаснікі называлі яго Златавустам. Многія яго кнігі дайшлі да нас. Яны сведчаць пра тое, што і ў старажытнасці Беларусь была багатая на таленты.



*Праверка:* 1 2 3 4 5

# Цікава ведаць

**Кірыла Тураўскі (каля 1130 — каля 1182)**

Пісьменнік-прапаведнік, выдатны майстар аратарскай прозы, царкоўны дзеяч XII ст. Быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу.

Кірыла Тураўскі нарадзіўся і выхоўваўся ў Тураве, быў сынам багатых бацькоў. Атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней спасціг вышэйшыя навукі і мастацтвы ад грэчаскіх настаўнікаў.

Рана стаў паслушнікам аднаго з тураўскіх манастыроў. Зачыніўшыся ў манастырскай вежы, Кірыла Тураўскі маліўся, займаўся літаратурнай дзейнасцю. Праведнае жыццё, адукаванасць, красамоўства зрабілі імя царкоўнага дзеяча вядомым яшчэ ў маладосці.

Ён пісаў аб радасцях чалавечага жыцця, харастве навакольнай прыроды, праяўляў асаблівы клопат пра духоўную дасканаласць суайчыннікаў.

Высокамастацкія аратарскія творы Кірылы Тураўскага склалі залаты фонд старажытнай літаратуры. Яны на працягу многіх стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю, памнажаліся і разыходзіліся ў сотнях рукапісных спісаў. Менавіта таму нашы продкі называлі асветніка Златавустам.

# Спасылкі

http://icesun.com.ua/node/3399 - малюнак на 1 слайдзе
http://samoe-vazhnoe.blogspot.com.by/2015/11/kostumi-respublik-sssr.html – хлопчык і дзяўчынка

Асіпчук, Л.І. Мая Радзіма – Беларусь : тэматычныя распрацоўкі ўрокаў. 4 клас/ Л.І. Асіпчук. – Мазыр : Содействие, 2010. – 180 с.

Бутрамееў, У. Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай: Для малод. і сярэд. шк. узросту / У. Бутрамееў. – Мн.: БелЭн, 2002. – 128 с.

Лузгіна, А.Г. Мая Радзіма – Беларусь : план-канспект урокаў : 4 клас /А.Г.Лузгіна, А.Г. Астроўская. – Мінск : Аверсев, 2016. – 187 с.

Ракуць, В.У. Толькі пад небам Бацькаўшчыны : работа па кнізе «Беларусь – наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку» / В.У. Ракуць, Т. П. Ракуць. – Мінск : Пачатковая школа, 2006. – 264 с. – (Б-ка «Пачатковай школы»).

Чалавек і свет. Мая Радзіма - Беларусь : падруч. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання /С.В.Паноў [і інш.]. - Мінск : Выд. цэнтр БДХ, 2013.

Партрэты ўзяты ў журналах «Пачатковая школа» і «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіця, сад, школа»